# Калейдаскоп

лістапад 2022

**Школьная газета №3 (43)**

*“Наша мова для нас святая, бо яна нам ад Бога даная”*

*Ф. Багушэвіч*






# Паэты і пісьменнікі пра мову

**Калейдаскоп**
**лістапад 2022**

**Ніякае багацце людзей не бывае даражэйшым за іх родную мову. (Я. Колас)**

**Толькі праз родную мову чалавек можа стаць беларусам, бо ў ёй хімія і фізіка, гісторыя і батаніка, эканоміка і культура таго, што называецца нацыяй, народам. (Я. Сіпакоў)**

**Мова — гэта вялікі народны скарб. Яе нельга не паважаць, як нельга не паважаць родны народ. (І. Мележ)**

**Не саромся, беларус, гаманіць па-свойму — на роднай мове бацькоў і дзядоў сваіх. Шануй сваю мову, шануй свае песні, свае казкі, звычаі і ўсё роднае — гэта спадчына дзядоў і вялікі нацыянальны скарб. Толькі тады цябе ўсе будуць шанаваць як чалавека, калі сам сябе будзеш шанаваць — калі не адкінеш свайго нацыянальнага ўласнага багацця. А першы скарб нацыянальны — гэта родная мова. (З. Бядуля)**

**Хто не шануе родную мову, той не шануе сябе самога, ні свой род, ні сваіх дзядоў-бацькоў, якія той жа мовай гаварылі. (В. Ластоўскі)**

**Яно добра, а нават і трэба знаць суседскую мову, але найперш трэба знаць сваю. (Ф. Багушэвіч)**

**Родная мова, быццам цэмент, звязвае людзей. Яна дае ім найлепшы спосаб разумець адзін аднаго, адной думкай жыць, адной долі шукаць. (Цётка)**



# Народныя традыцыі





За ўстойлівае непагодлівае надвор’е месяц **лістапад** называлі яшчэ **“мачарэц”** (ад старажытнарускага слова “мача”, якое азначала “дажджлівае надвор’е”). У царкоўнаславянскай гэтае слова мела яшчэ і значэнне “балота”, а ў славенскай – “непагадзь”. У лістапада ёсць і іншыя старажытныя назвы, якія адносяцца да зімовай пары, якая надыходзіла: ледзень, лёдавы каваль, лёдастаў, паўзімнік, пярэдаднік зімы, снегавей, вароты зімы.

Надвор’е ў лістападзе звычайна няўстойліва-сцюдзёнае. Цяжкія свінцовыя хмары закрываюць сабой гарызонт, дзьме пранізлівы вецер, зрываецца дождж. Дзень і без таго нядоўгі, а ад непагадзі здаецца яшчэ карацейшым. Акрамя гэтага, ночы, пазбаўленыя з-за хмар зорнага ззяння, да з’яўлення снежнага покрыва самыя цёмныя. “Прыцемкам года” называлі нашы продкі лістапад. Частыя працяглыя дажджы ператваралі дарогі ў непраходныя балоты. За гэта адзінаццаты месяц года нашымі продкамі быў празваны “бездарожнікам”.

Як звычайна, назіранні селяніна ў лістападзе накіраваны на стан прыроды, паводзіны жывёлы, птушак, па якіх ён вызначае будучае надвор’е. Напрыклад: неба ўсю ноч чыстае, але вакол месяца з’явіліся вялікія кругі – будзе мароз; калі ж кругі гэтыя злёгку пачырванеюць – магчымы нават снегапад з ветрам. Калі дым з коміна падымаецца вертыкальна ўверх, няхай сабе і ў непагадзь, хутка надвор’е наладзіцца. Куры рана сядаюць на седала – маразы наступаюць, і чым вышэй узбіраюцца хахлаткі, тым мацнейшы мароз ударыць. Месяц у бляклую дымку захутваецца – на працяглую непагадзь. Калі снег выпадзе на зямлю, якая замерзла, то можна чакаць добры ўраджай збожжавых.

**Сказана як звязана**

У лістападзе гола ў садзе.
Лістапад зіме сцежку пракладае.
Лістапад-паўзімнік: мужык з калёсамі развітваецца, у сані перабіраецца.
Калі ў лістападзе грыміць, араты вясну сніць.
Лістапад снегу навее – хлеба прыбудзе, а вада разальецца – сена набярэцца.

# Народныя традыцыі

**Калейдаскоп**
**лістапад 2022**

## НАРОДНЫЯ СВЯТЫ ЗАЛАТОГА ЛІСТАПАДА

**Лістапад – залаты лістапад…**

«Лістапад снегу навее – хлеба прыбудзе, а вада разальецца – сена набярэцца», – так гаварылі нашы продкі пра гэты апошні месяц восені.

У пачатку лістапада адлятаюць апошнія чароды качак, дрэвы стаяць ужо амаль без лісця, тэмпература паветра ніжэй нуля, з'яўляюцца туманы. Імжыстыя дажджы ў другой палове месяца звычайна змяняюцца на мокры снег.

У гэты час самае месца ўспомніць тых апекуноў, якія спрыялі земляробу, і, у першую чаргу, продкаў, «Дзядоў».

**1 лістапада. Усе Святыя**. Памінальны дзень у беларусаў-католікаў. «Па Усіх Святых холад уйме ўсіх». У гэты дзень варылі кашу, ставілі на стол стакан вады, клалі хлеб і столькі лыжак, колькі ў хаце «дзядоў» (памерлых продкаў).

**2 лістапада. Задушны дзень.** Працяг памінальных дзён у католікаў.

Асяніны (Змітраўка, Змітравы Дзяды, Казанскія Дзяды) – памінальны дзень перад Змітрам (пятніца). Гаспадар заклікаў «дзядоў» за стол такімі словамі:

*Святыя дзяды, завём вас,*
*Хадзіце да нас!*
*Ёсць тут усё, што Бог даў,*
*Што я для вас ахвяраваў,*
*Чым толькі хата багата.*
*Святыя дзяды! Просім вас,*
*Хадзіце, ляціце да нас.*

Пра гэтыя дні таксама казалі: «Жылі дзяды – не бачылі бяды, а ўнукі набраліся мукі».

У праваслаўных вернікаў – **Дзмітрава (Памінальная, Радзіцельская) субота** – працяг Асянін. У гэты дзень прыкмячалі: калі выпадзе снег, то будзе ён і на Вялікдзень.

**14 лістапада. Кузьма-Дзям'ян ( Кузьмінкі)** – свята шаўцоў, кавалёў. Існуюць паданні пра кавалёў Кузьму і Дзям'яна, якія змагаліся са змеем. У старой прыказцы зазначаецца: «Кузьма да Дамян – два ліцвіны, прынеслі гаршочак бацвінні» (Насовіч, 1870).

**Піліпаўскія Дзяды** – памінальны дзень перад Піліпаўкай у пятніцу і суботу (Заходняе Палессе). На Глушчыне вядома прыказка: «Піліпаўскі дзед кажа: хоць трашчу, але не пушчу».

**27 лістапада. Запусты (Загавіны на Піліпаўку)** – дзень перад Піліпаўкай.

**28 лістапада. Піліпаўка (Калядны, Піліпаўскі пост).** Шасцітыднёвы перадкалядны пост (да 6 студзеня). Гаварылі: «У Піліпаўку дзень да палудня»

Лічылася, што ў Піліпаўку збіралася «воўчае вяселле», хадзілі ваўкі зграямі. «Ек Піліпаўка настала, то ваўкі ідуць гайною» (Тураўскі слоўнік, 1984). Заўважалі: калі на Піліпаўку надвор'е хмарнае або снежнае, то травень будзе мокры.

**30 лістапада. Андрэй.** Дзяўчаты вечарам напярэдадні варажылі, сыпалі пад падушку ячмень са словамі: «Святы Андрэю, я ячмень сею, дай жа ты мне знаць, з кім я буду жаць» (Беларуская крыніца, 1928).

**З гэтага часу пачыналіся Вячоркі.**

# Папулярызацыя беларускай мовы

**Калейдаскоп**
**лістапад 2022**

**Навекі ў нашых сэрцах**

**3 лістапада** мы адзначылі **140-годдзе з дня нараджэння славутага беларускага песняра Якуба Коласа.** Нельга пераацаніць дзейнасць гэтага пісьменніка: яго творы з'яўляюцца актуальнымі і сёння, таму і папулярнасць іх не спадае.

У рамках мерапрыемстваў па папулярызацыі беларускай мовы ў нашай школе таксама ўрачыста ўшанавалі памяць Якуба Коласа. Лектарская група з ліку вучняў нагадала школьнікам 5-11 класаў пра дзяцінства пісьменніка, прыгадала яго вядомыя і невядомыя творы. Усе разам падпявалі пад песню «Мой родны кут», якая напісана на словы Я.Коласа.

Бясспрэчна, жыццё Якуба Коласа– яскравы ўзор служэння свайму народу, сваёй Бацькаўшчыне. А значыць, знаёмства з такімі асобамі спрыяе выхаванню патрыятызму вучняў.

**Настаўнік беларускай мовы і літаратуры Пышнюк А.А.**



# Папулярызацыя беларускай мовы



**Ці ведаеш ты сваю мову?**

**17 лістапада** ў рамках папулярызацыі беларускай мовы ў **2 «В» класе** прайшло пазакласнае мерапрыемства «Ці ведаеш ты сваю мову?» Мерапрыемства праходзіла ў форме гульні-падарожжа. У класе было дзве каманды: «Зычныя»і «Галосныя». Каманды выконвалі розныя заданні: адгадвалі загадкі, перакладалі словы, разгадвалі шарады, тлумачылі фразеалагізмы, збіралі часткі прымавак у цэла,расшыфроўвалі прыказкі, пазнавалі слова па яго лексічным значэнні. Мерапрыемства садзейнічала стварэнню ўмоў для пашырэння і ўзбагачэння слоўнікавага запасу школьнікаў; развіццю ў вучняў кемлівасці, пачуцця слова; фарміраванню ўмення творчага прымянення ведаў; выхаванню цікавасці да мовы, культуры маўлення.








# Юбілейныя даты






**Якуб Колас** (сапраўднае імя — Канстанцін Міцкевіч) нарадзіўся ў 1882 годзе ў вёсцы Акінчыцы (сёння — тэрыторыя горада Стоўбцы) у сям'і лесніка. Бацькі будучага пісьменніка былі родам з вёскі Мікалаеўшчына. У Канстанціна было яшчэ дванаццаць братоў і сясцёр. Але з-за недаядання і хвароб да дарослага ўзросту дажылі дзевяць.

Сям'я Міцкевічаў з-за прафесіі бацькі часта мяняла месца жыхарства. Таму адукацыю хлопчык атрымліваў спачатку дома, а толькі потым у школе. У 12-гадовым узросце Міцкевіч упершыню знаёміцца з беларускай літаратурай. Канстанцін скончыў спачатку народную школу, а затым, у 1902 годзе, Нясвіжскую настаўніцкую семінарыю. Падчас вучобы захапіўся мастацкай літаратурай: чытаў як рускіх класікаў, так беларускіх і замежных аўтараў. Пісаў уласныя вершы на рускай мове. Таксама праявіў сябе як этнограф — запісваў у сшыткі народны фальклор. У 1902-1906 гадах працаваў настаўнікам у Пінскім раёне ў вёсках Люсіна і Пінкавічы. Працягваў збіраць фальклор.

Быў адным з арганізатараў незаконнага настаўніцкага з'езду 1906 года. З'езд разагнала паліцыя. А Міцкевічу забаранілі займацца настаўніцкай дзейнасцю. Але ён да 1912 года працаваў нелегальна. Пазней падзеі гэтых гадоў ляглі ў аснову рамана «На ростанях».

У 1906-1907 гадах у вёсцы Смалярня адкрыў прыватную школу. У 1907 пераехаў у Вільню, дзе працаваў загадчыкам аддзела літаратуры ў «Нашай Ніве», але па ўказанні паліцыі звольніўся і пакінуў горад. У пачатку 1908 года некаторы час працаваў настаўнікам у вёсцы Сані, пасля чаго быў арыштаваны па абвінавачванні ў рэвалюцыйнай дзейнасці, накіраванай на ліквідацыю дзеючага дзяржаўнага ладу.

Міцкевіча асудзілі на 3 гады, увесь час зняволення (1908-1911) ён правёў у Мінскай турме. На працягу тэрміну працягваў ствараць творы. Пасля вызвалення вярнуўся на Піншчыну, дзе працаваў настаўнікам да 1914 года. У 1915 разам з сям'ёй эвакуіраваўся ў Падмаскоўе, дзе працаваў настаўнікам, але неўзабаве яго мабілізавалі ў войска.

# Юбілейныя даты






У 1916 годзе па экспрэс-праграме скончыў Аляксандраўскае ваеннае вучылішча і быў накіраваны на службу ў Пермь. У 1917 накіраваны на Румынскі фронт. Але з-за хваробы пакінуў зону баявых дзеянняў, а пазней як настаўнік быў дэмабілізаваны. З 1918 да 1921 года працаваў настаўнікам у горадзе Абаянь (Курская вобласць). У 1921 вярнуўся ў Мінск.

20-я гады — час творчага поспеху для Якуба Коласа. Ён становіцца вядомым пісьменнікам, яго чытаюць і ведаюць. Ён вядзе актыўнае грамадскае жыццё. З 1929 займае пасаду віцэ-прэзідэнта Акадэміі навук БССР. Прымае ўдзел у з'ездах пісьменнікаў.

З сярэдзіны 20-х гадоў ім зацікавіліся рэпрэсіўныя органы. У 1925 у кватэры Коласа праходзіць вобшук, частка дакументаў канфіскуецца. Пісьменніку ладзяць шматгадзінны допыт. У 30-х сітуацыя пагаршаецца. Колас вымушаны пакаяцца ў прэсе ва ўсіх прыпісаных яму грахах і паабяцаць у далейшым пісаць толькі правільную, ідэалагічна вывераную літаратуру. Зрэшты, ціск на яго гэта не спыніла.

У 1938 годзе ў кватэры паэта праходзіць новы ператрус. Падчас вайны Якуб Колас жыве ў Маскве і Ташкенце. Пасля вызвалення Мінска ў 1944 годзе вяртаецца на радзіму. Працуе ў Акадэміі навук, вядзе актыўную грамадска-палітычнае жыццё: абіраўся дэпутатам вярхоўнага савета БССР (1938-1956) і вярхоўнага савета СССР (1946-1956). Быў старшынёй Беларускага рэспубліканскага камітэта абароны міру.

У апошнія гады Колас шмат хварэў. За 10 гадоў 26 разоў перанёс запаленне лёгкіх. Але працягваў ствараць новыя творы і памёр за працоўным сталом 13 жніўня 1956 году ад сардэчна-сасудзістай недастатковасці. Пахаваны на Вайсковых могілках у Мінску, недалёка ад магілы Янкі Купалы.

У дзень смерці Якуб Колас напісаў ліст у вышэйшыя органы партыі, у якім выказаў занепакоенасць станам беларускай мовы, прадказаў яе заняпад. Прапаноўваў меры па абароне беларускай мовы.

Сам ліст доўгія гады быў засакрэчаны. Аб яго існаванні не ведалі нават блізкія сябры паэта. Упершыню апублікаваны ліст быў у 1990 годзе.

# Юбілейныя даты

**Калейдаскоп**
**лістапад 2022**




**Цішка Гартны**, сапр.: Зміцер (Змітро) Хведаравіч Жылуновіч (4 кастрычніка 1887, м. Капыль, Слуцкага павета Мінскай губерні, цяпер Капыльскі раён Мінскай вобласці — 11 красавіка 1937, Магілёў) — беларускі пісьменнік, паэт і перакладчык, грамадскі і дзяржаўны дзеяч. Акадэмік АН БССР (1928).

Нарадзіўся ў мястэчку Капыль 4 лістапада 1887 года Мінскай губерні ў сям’і беззямельнага селяніна. Бацька яго працаваў гарбаром, а маці падзёншчыцай. Вучыўся спачатку ў прыватных настаўнікаў (т. зв. «дарэктараў»). У 1905 годзе скончыў двухкласнае вучылішча ў Капылі. Працаваў пастухом па найму, з 1906 года ў гарбарнай майстэрні. Ад бацькі Зміцер навучыўся добра чытаць па-старaславянску. Падручнікамі былі евангелле, часаслоў і псалтыр. У 1903 годзе ў Капылі ствараецца сацыял-дэмакратычная арганізацыя. З 1904 года юнак Жылуновіч прымае ў рабоце арганізацыі актыўны ўдзел, а ў 1906 ён выбраны членам камітэта гэтай арганізацыі. К гэтаму часу ён прачытаў ужо многа кніг з бібліятэкі сацыял-дэмакратаў. Сярод іх былі творы Нікіціна і Някрасава, Чэхава і Надсана, Талстога і Горкага.

У 1909 годзе, пасля закрыцця гаспадаром гарбарні, у пошуках работы аб’ездзіў многія гарады Беларусі, Літвы і Украіны. У 1910 годзе выдаваў рукапісны літаратурна-грамадскі часопіс «Заря», у 1911 супрацоўнічаў і быў рэдактарам першых нумароў часопіса «Голос низа» з дадаткам «Вольная думка». У 1912 годзе Ц. Гартны працаваў гарбаром у Ковенскай губерні, вёў прапагандысцкую работу. У 1913 пераехаў у Пецярбург, працаваў на заводзе «Вулкан», быў членам таварыства «Знание» і міжраённага аб’яднання сацыял-дэмакратаў. Сябры дапамагалі Ц. Гартнаму атрымаць работу ў выдавецтве «Новый человек». У 1915 быў мабілізаваны ў войска, але праз месяц яго адпусцілі. У 1916 працаваў у Беларускім бежанскім камітэце і выдаваў газету «Дзянніца», якая пасля закрыцця ў 1915 «Нашай нівы» адыграла вялікую ролю ў гуртаванні беларускіх рэвалюцыйных сіл.

Вялікую Кастрычніцкую сацыялістычную рэвалюцыю Ц. Гартны ўспрыняў як сваю рэвалюцыю і першым з беларускіх пісьменнікаў вітаў яе.

# Юбілейныя даты






Рэвалюцыя акрыліла паэта, спрыяла прыліву новых творчых сіл, ён становіцца сакратаром Беларускага нацыянальнага камісарыята пры Наркамаце РСФСР. Некаторы час рэдагаваў «Дзянніцу» — першую савецкую газету на беларускай мове. У кастрычніку 1918 Прэсненскі райком партыі Масквы прыняў яго ў РКП(б). Уваходзіў у склад бюро Беларускай секцыі РКП(б). З 1.1.1919 старшыня часовага рабоча-сялянскага Савецкага ўрада Беларусі. Як сведчаць многія крыніцы, быў і аўтарам яго маніфеста. З сакавіка 1919 — рэдактар і сакратар газеты «Красная заря» (Харкаў), з чэрвеня таго ж года — палітработнік у штабе 14-й арміі, якая вяла баі супраць дзянікінцаў. Пазней пр’ацаваў у штабе Заходняга фронту ў Смаленску. У 1921 пераехаў у Мінск. Быў рэдактарам газеты «Савецкая Беларусь», часопіса «Полымя», узначальваў Дзяржаўнае выдавецтва БССР і Цэнтральны архіў БССР, працаваў намеснікам Наркома асветы БССР і загадчыкам Галоўмастацтва, у Інстытуце гісторыі АН БССР, загадваў выдавецтвам АН БССР. У 1923 пленум ЦК КП(б)Б прыняў пастанову аб прысваенні Ц. Гартнаму звання народнага паэта Беларусі, аднак выканана пастанова не была. Член ЦБ КП (б) Б (31.12.1918—4.3.1919), кандыдат у члены ЦК КП(б)Б (10.1.1927—6.2.1929), член ЦВК БССР у 1920—31. 16.1.1931 пастановай ЦКК КП(б)Б бьгў выключаны з партыі з фармуліроўкай «за свядомае правядзенне нацыянал-апартуністычнай і нацыянал-дэмакратычнай лініі, за ўдзел у антыпартыйных групоўках у КП(б)Б, за сувязь з чужымі і варожымі справе пралетарыяту нацдэмаўскімі і фашысцкімі элементамі…». ЦКК ВКП(б) на пасяджэнні 15.3.1931 пацвердзіла пастанову ЦКК Кампартыі Беларусі. Улічваючы заяву Ц. Гартнага аб прызнанні сваіх памылак і прадстаўленую яму характарыстыку партарганізацыяй завода «Камунар», Прэзідыум ЦКК ВКП(б) палічыў магчымым перагледзець гэту пастанову праз год. Аднак гэта рашэнне не было перагледжана. 15.11.1936 арыштаваны органамі НКУС. У час знаходжання ў Мінскай турме катаваўся, быў абвешчаны псіхічна хворым. 7.4.1937 пераведзены ў Магілёўскую псіхіатрычную лячэбніцу, дзе, паводле афіцыйнай версіі, памёр ад гангрэны лёгкіх, у сапраўднасці ж — скончыў жыццё самагубствам.

# Юбілейныя даты






15.10.1955. Ц. Гартны быў рэабілітаваны ў грамадзянска-прававых адносінах. У 1987—88 адбылася поўная палітычная рэабілітацыя.

Літаратурную дзейнасць пачаў у 1908 на старонках «Нашай нівы. У 1913 выйшаў зборнік «Песні». Матывы дарэвалюцыйных вершаў навеяны рэвалюцыйна-вызваленчым рухам. Шмат увагі надаваў праблемам беларускага адраджэння («Да Нёмана», «Сявец», «Роднай краіне», «Каваль», «Да надзеі»). Новай для беларускай паэзіі была рабочая тэматыка, якую паэт распрацаваў у цыкле вершаў, прысвечаных гаротнай долі вандроўных гарбароў. Значнае месца займаюць вершы, у якіх паэтызуецца сялянская праца («Касьба», «Песня жняі»). У паслякастрычніцкі час выйшлі зборнікі вершаў «Песні працы і змагання», «Урачыстасць». Талент Ц. Гартнага як мастака слова найбольш праявіўся ў прозе. Першыя апавяданні былі напісаны ў дакастрычніцкі час. Па форме гэта лірычныя мініяцюры «Насустрач узышоўшаму сонцу», «Думкі», «На ўсходзе сонца», «Адвячоркам». Найбольш значныя апавяданні савецкага часу ўвайшлі ў зборнікі «Трэскі на хвалях» і «Прысады». Шмат увагі пісьменнік звярнуў на праблему станаўлення новай інтэлігенцыі. У 1914—29 працаваў над раманам «Сокі цаліны. Напісаў п’есы «Хвалі жыцця», «Сацыялістка», «На стыку», «Дзве сілы». Выдаў зборнік літаратурна-крытычных артыкулаў «Узгоркі і нізіны». У палемічным запале недаацэньваў ролі «Узвышша». Шэраг публіцыстычных артыкулаў па гісторыі беларускага нацыянальна-рэвалюцыйнага руху і ўспаміны пра ўтварэнне БССР Ц. Гартны змясціў у 20-я г. у часопісе «Полымя». Пераклаў на беларускую мову раман А. Фадзеева «Апошні з Удэге».

Ц. Гартны з’яўляўся не толькі пісьменнікам, выдатным публіцыстам і грамадскім працаўнікам, але і буйным дзяржаўным дзеячом. Ён шматразова выбіраўся членам ЦВК БССР і Савета Нацыянальнасцей СССР.Ц. Гартны займаў рад адказных пасад. Ён быў рэдактарам газеты “Савецкая Беларусь” і часопіса “Полымя”, дырэктарам Дзяржаўнага выдавецтва Беларусі, намеснікам міністра асветы БССР, членам Інстытута беларускай культуры, членам калегіі гістпарта, старшынёй Беларускага таварыства культурнай сувязі з замежжам і г.д. З 1928 г. ён правадзейны член Акадэміі навук БССР.

# Юбілейныя даты






**Паўлюк Багрым** нарадзіўся (2(14) лістапада 1812 у вёсцы Крошын Навагрудскага павета Гродзенскай губерні, цяпер Баранавіцкі раён Брэсцкай вобласці ў сям'і рамесніка.

Вучыўся ў пачатковай парафіяльнай школе, фундатарам якой быў ксёндз В. Магнушэўскі. Пазнаёміўся з вальнадумнай паэзіяй; пачаў пісаць сам. У сувязі з сялянскімі хваляваннямі 1828 г. у Крошыне і за распаўсюджанне верша «Бунт хлопаў» (варыянт «Рабункаў мужыкоў» Я. Баршчэўскага) прыцягваўся да следства, быў здадзены ў рэкруты. Калі вярнуўся, Паўлюк Багрым, як і яго бацька, працаваў кавалём.

У рамястве дасягнуў мастацкіх вяршыняў, пра што сведчыць зробленая ім каваная жырандоля, якая і сёння захоўваецца ў Крошынскім касцёле. Гэта ўзор мастацкай коўкі на Беларусі XIX века.

Памёр Паўлюк Багрым каля 1891 года, пахаваны на мясцовых могілках.

У 1985 годзе ў Крошыне адкрыты музей народнага мастацтва і рамёстваў імя Паўлюка Багрыма.

У 2005 годзе ў горадзе Баранавічы ў мікрараёне Бараўкі адна з вуліц названа ў гонар Паўлюка Багрыма.

# Юбілейныя даты

**Калейдаскоп**
**лістапад 2022**




**Лукша Валянцін Антонавіч** нарадзіўся 16 лістапада 1937 года ў Полацку ў сям'і служачага. Беларускі паэт, публіцыст, драматург, перакладчык.

У 1956 годзе скончыў Полацкі лясны тэхнікум, а ў 1976 годзе – Вышэйшую партыйную школу пры ЦК КПСС. Працаваў памочнікам сакратара Пензенскай аэрафоталесаўпарадчай экспедыцыі. У 1958 годзе – інструктар Полацкага гаркама камсамола, камсарг трэста № 16 «Нафтастрой». З 1961 года – літсупрацоўнік полацкай газеты «Сцяг камунізму», загадчык аддзела міжраённай газеты «Ленінская іскра» (Полацк), карэспандэнт Беларускага радыё, загадчык аддзела літаратуры і мастацтва рэспубліканскай газеты «Чырвоная змена», адказны сакратар штомесячніка «На экранах Беларусі», з 1973 года – старшы рэдактар, з 1975 года – галоўны рэдактар Галоўнай рэдакцыі літаратурна-драматычнага вяшчання Беларускага радыё, з 1980 года – дырэктар выдавецтва «Юнацтва». Член Саюза пісьменнікаў СССР з 1978 года.

Узнагароджаны медалём і Ганаровым знакам А. П. Гайдара.

Літаратурную дзейнасць пачаў у 1956 годзе. Выйшлі кнігі вершаў «Гарады нараджаюцца сёння» (1964), «Атава» (1969), «Споведзь» (1973), «Белыя берагі» (паэма-хроніка, 1981), «Радзімыя плямы» (вершы і фельетоны, 1982), «Сляды памяці» (вершы і паэма, 1986), «Агонь і попел» (драматычныя паэмы, 1989), кніжкі вершаў, казак для дзяцей «Аркестр» (1972), «Зялёная бальніца» (1974), «Лета – круглы год» (1978), «Крылаты цэх» (1982), «Чароўны камень» (1987). Выдаў кнігі публіцыстыкі «Наша полацкая прафесія» (1966), «Рамантыкі шасцідзясятых» (1967), «Дзесяць дарог да чароўнага» (1970), «Полацк» (1973).

Аўтар п'ес, пастаўленых на тэатральнай сцэне, тэлебачанні і радыё: «Інтэгралы на цэгле» (1974), «Мая радня» (1975), «Свае крылы» (1976), «Вецер веку» (паводле аднайменнага рамана І. Гурскага, 1977), «Калі вяртаюцца буслы» (1982), «Асоль» (паводле твораў А. Грына, 1984), «Пад шыфрам «Зорачка» (1985).

Пераклаў п'есы С. Міхалкова «Дарагі хлопчык» (1986), М. Рошчына «Уся Надзея» (1986), Е. Таракоўскай «Казка пра Ямелю» (1990). Напісаў лібрэта да оперы «Барвовы золак» (пастаўлена ў 1979 годзе). Многія яго вершы пакладзены на музыку.

Памёр Валянцін Антонавіч 15 верасня 2012 года.

# Літаратурная старонка



**Восень**

**О хараство асенніх дзён празрыстых,
Бязгутарнасць прыроды і спакой.
Урачыста полем з пушчаў залацістых
Прыйшла туга і пала над вадой.**

**А там застыла яснасць даляў чыстых
Над цёмнай рунню й чорнай царінай,
І холад лёгкі ў косах прамяністых
Разліла сонца хваляй нежывой.**

**Наўкол сляды павольнага канання
І веліч нетутэйшага маўчання.
Прымаю корна сон зямлі азурны.**

**І летуціцца сцішанай душы
Такі ж спакой, халодны і бязбурны,
І адцвітанне яснае ў цішы.**

**У. Жылка**



# Цікава ведаць





# Цікава ведаць

**Калейдаскоп**
**лістапад 2022**






**Рэдактар Юрчанка С.А.**